Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 62 (76) | Серада, 26 снежня 1945 г.

## Завяршыць выкананне гаспадарчых задач

1945 год на ісходзе. Мы знаходзімся на парозе новага, 1946 года.

За бягучы, 1945 год, працоўныя нашага раёна пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі дасягнулі значных поспехаў у аднаўленні народнай гаспадаркі, зруйнаванай нямецкімі захопнікамі.

Разгарнуўшы соцыялістычнае спаборніцтва ў чэсць Перамогі многія сельсоветы, як Акцябрскі, Аніскавіцкі, Дзеткаўскі, Дзямідаўшчынскі і др. завяршылі выкананне збожжапаставак дзяржаве. Аднак раён у цэлым не выканаў плана хлебанарыхтовак, і 70 тон дзяржаўнага хлеба лічыцца за нашым раёнам. Асабліва ў вялікім даўгу перад дзяржавай застаўся Дзераўноўскі сельсовет, выканаўшы план збожжанарыхтовак на 52 процанты, Каменскі, выканаўшы план на 71 процант.

Наш раён знаходзіцца на апошнім месцы ў абласці і па бульбапастаўках. На 20 снежня план выканан толькі на 75,8 процанта. Асабліва ганебна адстаюць па выкананню бульбанарыхтовак Першамайскі сельсовет, выканаўшы план на 57,7 процанта, Худлінскі—на 63,2 процанта і другія. Гэта адставанне тлумачыцца тым, што кіраўнікі сельсоветаў і знаходзячыяся там упаўнаважаныя райкома і райвыканкома спынілі барацьбу за хлеб.

Не трэба забываць, што план здачы збожжа, бульбы і другіх сельскагаспадарчых прадуктаў—гэта закон для кожнай вёскі, сельсовета і яго трэба выканаць пры любых умовах.

Лічаныя дні засталіся да новага года. Пачэсныя задачы стаяць у гэтыя апошнія дні перад працоўнымі нашага раёна. На работнікаў мясцовай прамысловасці ўскладваюцца задачы—завяршыць выкананне вытворчага плана, даць больш насельніцтву тавараў шырокага спажывання. Поўным выкананнем абавязацельстваў перад дзяржавай па ўсіх відах сельскагаспадарчых прадуктаў павінны сустрэць новы год сяляне раёна.

Новы, 1946 год, сустракаецца ў дні, калі совецкі народ рыхтуецца да буйнейшай палітычнай падзеі—дню выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Падрыхтоўка да дня выбараў суправаджаецца палітычным і вытворчым уздымам совецкіх людзей. Задача партыйных, комсамольскіх арганізацый, сельскіх советаў узначаліць уздым мас, накіраваць іх энергію на выкананне і перавыкананне усіх планаў, на дастойную сустрэчу новага года.

## ГУРТКІ ПА ВЫВУЧЭННЮ ПАЛАЖЭННЯ АБ ВЫБАРАХ

Для ахопа ўсіх выбаршчыкаў агітацыйна-масавай работай у Антопале арганізавана 18 гурткоў па вывучэнню Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет і Канстытуцыі СССР.

Для работы гурткоў падабраны лепшыя памяшканні, дзе вывешаны лозунгі, прысвечаныя выбарам.

Добра працуюць агітатары т. т. Сцяпанава, Арсень Шпічык. Яны, праводзячы чыткі Палажэння, скарыстоўваюць такcама і артыкулы з газет па тэму выбараў.

**Стасевіч.**

## Чацверты пленум РК ЛКСМБ

22 снежня адбыўся IV пленум РК ЛКСМБ. На пленуме з дакладам аб выніках XIV пленума ЦК ВЛКСМ выступіў упаўнаважаны абкома ЛКСМБ тав. Сіцькоў.

Адзначыўшы праробленую работу раённай комсамольскай арганізацыяй, дакладчык астанавіўся на задачах, якія стаяць перад комсамольцамі і моладдзю раёна ў перыяд падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

Выступаючыя ў спрэчках члены пленума РК ЛКСМБ гаварылі аб праробленай рабоце комсамольскімі арганізацыямі ў перыяд падрыхтоўкі да выбараў, адзначалі недахопы.

Член пленума РК ЛКСМБ тав. Залешчук Марыя расказала, што комсамольская арганізацыя вёскі Кустовічы, Акцябрскага сельсовета разгарнула шырокую масава-палітычную работу сярод выбаршчыкаў, комсамольцы арганізавалі гурткі мастацкай самадзейнасці.

Комсамольцы гэтай арганізацыі да дня выбараў у Вярхоўны Совет СССР узялі абавязацельства выканаць 50 процантаў плана нарыхтоўкі і вывазкі леса сельсовета сваей арганізацыяй. 16 падвод і 7 лесарубаў комсамольцаў і моладзі выехалі на лесанарыхтоўкі ў Беразоўскі леспрамгас.

Следуючы прыкладу комсамольцаў і моладзі вёскі Кустовічы, пленум РК ЛКСМБ узяў абавязацельства 50 процантаў плана раёна па нарыхтоўцы і вывазцы лесу выканаць раённай комсамольскай арганізацыяй.

Пленум РК ЛКСМБ прыняў рашэнне, у якім намечаны мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне масава-палітычнай работы сярод моладзі і насельніцтва ў перыяд падрыхтоўкі да выбараў, а таксама аб актыўным удзеле комсамольцаў у выкананні народна-гаспадарчых задач, якія стаяць перад раёнам.

Партыйнае жыццё

# НА РАЁННЫМ СХОДЗЕ КОМУНІСТАЎ

23 снежня адбыўся агульны сход раённай партыйнай арганізацыі па выніках работы VIII пленума ЦК КП(б)Б.

З дакладам „Аб задачах партыйных арганізацый у сувязі з выбарамі ў Вярхоўны Совет СССР“ выступіў сакратар райкома КП(б)Беларусі тав. Яроцкі.

—Выбары ў Вярхоўны Совет СССР,—гаворыць дакладчык,—будуць праходзіць у перыяд пасляваеннай абстаноўкі, пасля вялікіх перамог, атрыманых совецкім народам над германскім фашызмам і японскімі імперыялістамі.

У перыяд падрыхтоўкі да выбараў раённая партыйная арганізацыя правяла значную работу па разгортванню масава-палітычнай работы сярод насельніцтва. У раёне створаны агіткалектывы, якія ўзначальваюцца комуністамі.

Асноўная наша задача,—гаворыць тав. Яроцкі,—гэта глыбока растлумачыць выбаршчыкам іх правы і абавязкі, расказаць аб вялікіх перамогах, атрыманых совецкім народам у Вялікай Айчыннай вайне, аб арганізуючай і кіруючай ролі нашай большэвіцкай партыі і г. д. Найбольш важнейшым пытаннем з'яўляецца складанне спісаў выбаршчыкаў, афармленне выбарчых участкаў. Уся масава палітычная работа павінна разгортвацца на выбарчых участках.

Пасля даклада разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Выступаўшыя комуністы т. т. Мурыва, Косцікаў, Шунько, Белкіна, Сакалоўскі і другія, нараду з прароблёнай работай ускрылі рад недахопаў і падверглі рэзкай крытыцы асобныя партыйныя арганізацыі, якія дрэнна рыхтуюцца да выбараў. Рэзка крытыкавалі асобых комуністаў, як т. Хланкова за марудлівасць тэлефанізацыі выбарчых участкаў, т. т. Берзіна, Сітнікава, якія недастаткова праводзяць масавую работу на вёсцы.

У канцы выступіў сакратар абкома КП(б) Беларусі тав. Красоўскі, накіраваўшы ўвагу партыйнай арганізацыі на ўзмацненне палітычна-масавай работы сярод выбаршчыкаў, на выкананне гаспадарчых задач, якія стаяць перад раёнам.

Партыйны сход прыняў разгорнутае рашэнне, накіраванае на паляпшэнне агітацыйна-масавай работы па падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет СССР, на паспяховае выкананне гаспадарча-палітычных задач.



У бібліятэцы-чытальні калгаса імені Тімразева, Рыбінскага раёна Яраслаўскай вобласці.

На здымку: загадчыца бібліятэкай Л. Н. Бараева раскладвае атрыманыя журналы.

Фотахроніка ТАСС.

## НАРАДА ПАРТЫЙНА-СОВЕЦКАГА АКТЫВА

25 снежня райком партыі правёў нараду партыйна-совецкага актыва.

На нарадзе абмеркаваны пытанні: аб афармленні выбарчых участкаў, агітпунктаў, аб складанні спісаў выбаршчыкаў і аб завяршэнні пастаўкі дзяржаве сельскагаспадарчых прадуктаў 1945 года.

На нарадзе прысутнічалі старшыні ўчастковых выбарчых камісій, загадчыкі агітпунктаў.

## Дрэнна працуе хата-чытальня

Добра арганізаваць работу хата-чытальні, асабліва зараз, у перыяд падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет СССР—першачарговая задача кожнага загадчыка хата-чытальні.

Але далёка не зразумела сваіх абавязкаў загадчыца Худзінскай хата-чытальні т. Караваццкая В. А. Яна пусціла ўсю работу на самацёк. За мінулы месяц тут не было арганізавана ні адной лекцыі для насельніцтва, гутаркі. Працуе дрэнна хата-чытальня і ў снежні: большасць часу яна бывае закрыта.

Трэба адзначыць і тое, што памяшканне хата-чытальні ўтрымліваецца ў запушчаным састаянні, не апальваецца.

**В. Чыгіроў.**

## ПАПРАЎКА

У надрукаваным у газеце „Перамога“ № 61 ад 19 снежня 1945 года ў рашэнні выканаўчага камітэта Антопальскага раённага Совета дэпутатаў працоўных „Аб зацверджанні ўчастковых выбарчых камісій па выбарах у Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцей“ прапушчаны члены выбарчых камісій:

па Аніскавіцкаму выбарчаму ўчастку **№ 40 Пакалюк Агаф'я Максімаўна**—ад сялян вёскі Чэлішчавічы,

па Першамайскаму выбарчаму ўчастку **№ 41 Несцярук Елена Васільеўна**—ад сялян вёскі Свеклічы.

В. а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ.

У народным судзе Антопальскага раёна будзе слухацца грамадзянская справа аб скасаванні шлюба Труш Івана Фёдаравіча з яго жонкай Труш Ефрасіней Нікалаеўнай, пражываючыя ў вёсцы Дзераўная, таго-ж сельсовета.

Мішчук Фёдар Антонавіч, пражываючы ў вёсцы Камень—Шляхецкі Акцябрскага сельсовета ўзбуджае справу аб разводзе з яго жонкай Мішчук Агрыпінай Майсееўнай, пражываючай там-жа.

Справа будзе слухацца ў Антопальскім народным судзе.

**Нарсуд.**

ГЛ 11883 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Совецкая вуліца, дом № 1